ля Витебского государственного педагогического института имени С.М. Кирова в количестве 586 дел за 1775-2006, 2010 гг. образуют личный фонд № 2154. Среди документов фонда: воспоминания лиц, переживших Холокост, списки мирных жителей, уничтоженных гитлеровцами в оккупированном Витебске в 1941-1944 гг., тематические картотеки о жизни и творчестве Марка Шагала, истории еврейской диаспоры Витебщины, паспорта еврейских кладбищ Витебской области, документы по истории г. Витебска дореволюционного периода [6].

Документы этих фондов доступны для широкого круга исследователей.


1. Государственный архив Витебской области: путеводитель, 1917–2006/ сост. Т.В. Буевич, Ю.С. Петухов. – Минск: Медисонт, 2011. – 936 с.
2. Фондовый каталог [электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/fond/113616/. – Дата доступа: 19.08.2021.
3. Фондовый каталог [электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/fond/85000/. – Дата доступа: 19.08.2021.
4. Фондовый каталог [электронный ресурс]. – Режим доступа: https://fk.archives.gov.by/fond/120035/. – Дата доступа: 19.08.2021.
5. Фондовый каталог [электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/fond/112628/. – Дата доступа: 19.08.2021.
6. Фондовый каталог [электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/fond/104625/. – Дата доступа: 19.08.2021.



**Булаты П. Ю.**


## ПРАБЛЕМА ЗАХАВАННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ НЕКРОПАЛЕЙ У ГАРАДСКОЙ ПРАСТОРЫ (ПРЫКЛАД ГОРАДА ЛЯХАВІЧЫ)


***Ключавыя словы:*** могілкі, канфесіі, этнічныя супольнасці, культурна-гістарычная спадчына, Ляхавічы.


Неад’емнай часткай ландшафту любога беларускага горада з’яўляюцца некропалі. Вывучэнне прасторы гарадской некрапалісткі – важны аспект мясцовай гісторыі, якая прадстаўляе асаблівую частку гарадской культуры з функцыяй захавання лакальнай памяці. Адметнасцю могілкавай прасторы беларускіх гарадоў з’яўляецца гістарычная сегрэгацыя месцаў пахавання гараджан, калі кожная этнічная і канфесійная супольнасць мела свой уласны некропаль.

Звернемся да прыкладу культуры арганізацыі і захавання некропаляў у прасторы горада Ляхавічы (раённы цэнтр у Брэсцкай вобласці) у гістарычнай рэтраспектыве і сучаснасці. У этнічнай і канфесійнай структуры горада перыяду XVI–XX ст. вылучаліся наступныя супольнасці: праваслаўныя (у перыяд з 1596 па 1839 г. – грэка-

каталікі), рыма-каталікі, яўрэі, татары [2, с. 53–62]. Так, па стане на канец XVIII ст. склалася прыкладна (прыблізнасць падлікаў абумоўлена розным тыпам крыніц у якіх адлюстроўваецца склад насельніцтва горада, звесткі мы ўвасобілі ў працэнтных суадносінах, іх хібнасць не вялікая і дапушчальная) такая этнаканфесійная карціна: 1) хрысціяне – 46 % (з іх 82,9 % прыходзілася на каталікоў, доля ўніятаў складала ўсяго 17,1 %); 2) яўрэі – 42 %; 3) татары – 12 % [5; 13]. Кожная з адзначаных супольнасцей мела ў горадзе свой некропаль. У працэсе вывучэння гістарычных пахаванняў намі было пастаўлена дзве задачы: 1) высветліць, дзе ў гарадской прасторы размяшчаліся некропалі пэўнай супольнасці; 2) вызначыць актуальны стан і ступень захаванасці розных некропалей.

Перш чым пяройдзем да прадметнага разгляду гарадскіх могілак, звернем увагу на адзін аспект. У дакументах другой паловы XIX ст. у Ляхавічах фіксуецца наяўнасць даўніх формаў пахавання, тыповых для старажытных паселішчаў, што лагічна: узнікненне Ляхавічаў датуецца XI ст. [7]. Гаворка ідзе пра пахаванні курганнага тыпу. Лакалізаваліся курганы на правым беразе ракі Ведзьмы насупраць дзядзінца былой фартэцыі [6]. Сёння гэтая тэрыторыя забудавана прыватнымі дамамі, сляды даўніх курганоў пры візуальным аглядзе мясцовасці не выяўлены.

**Праваслаўныя (уніяцкія) могілкі**. Першыя звесткі аб праваслаўных могілках у Ляхавічах датуюцца XVI ст. Згадваюцца яны ў мемуарах Ф. Еўлашоўскага. Так, у сакавіку 1572 г. памірае маці Еўлашоўскага, цела якой было з «*пристойною учтивостью поховане зостало в Ляховичах в цэркве руской*» [8]. Тут аўтар падае лакалізацыю некропаля – побач з ляхавіцкай праваслаўнай царквой.

Лакалізацыю могілак каля ўніяцкай царквы Святога Юрыя пацвярджаюць акты царкоўнай візітацыі XVII–XVIII стст. Так, у акце візітацыі 1680 г. на ляхавіцкіх грэка-каталіцкіх могілках фіксуецца асобнае памяшканне для дыякана [3, с. 131–132]. Згадваюцца могілкі і цягам XVIII ст. [4].

З улікам акрэсленых фактаў, а таксама ведаючы месцазнаходжанне даўняй Юр’еўскай царквы [1], не складана вызначыць месца тагачасных праваслаўных (уніяцкіх) могілак. У дадзены момант на месцы царквы знаходзіцца мемарыяльны помнік савецкім салдатам, якія загінулі ў 1941 г., а месца могілак часткова займаюць прыватныя жылыя дамы. Да тэрыторыі былых могілак, з’яўляючыся як бы іх працягам, прымыкаюць сучасныя гарадскія праваслаўныя могілкі.

Пахаванні на могілках датуюцца пачаткам XIX ст. Іх адметнасць – канфесійная змешанасць, якая тлумачыцца рэзкімі канфесійнымі пераменамі ў гісторыі горада канца XVIII – сярэдзіна XIX ст. Так, у гэты

перыяд адбылося закрыццё ўніяцкага прыходу (у 1784 г. будынак царквы прызнаны непрыдатным для правядзенне набажэнстваў, прыход часова пераносіўся ў вёску Падлессе [4]), пераасвячэнне ў 1867 г. каталіцкага прыходу ў праваслаўны [9]. Акрэсленая канфесійная дынаміка вызначыла структуру могілак: іх старая частка (да 1867 г.) каталіцкая, яна перамешваецца з праваслаўнымі пахаваннямі (пасля 1867 г. да 2010-х). На старой частцы могілак маюцца крушні пахавальных капліц розных архітэктурных стыляў: капліца Солтанаў (1830-я), капліца на месцы пахавання Дамініка Рэйтана (1850-я). Пахаванні XIX – першай паловы XX ст. – гэта ў асноўным надмагільныя пліты, рэдкія вертыкальныя помнікі, асобныя крыжы. На помніках фіксуюцца паэтычныя эпітафіі. Агульны стан старой часткі некропаля – задавальняючы.

**Каталікі**. У працэсе даследавання каталіцкіх пахаванняў у Ляхавічах, можна вылучыць дзве лакацыі гарадскіх каталіцкіх могілак.

Першыя – «старыя» – могілкі знаходзіліся каля Узвіжанскага касцёлу на рынку, які ў 1867 г. быў прасвечаны ў праваслаўную царкву. Наяўнасць могілак каля касцёла пацвярджаюць звесткі з актаў касцельных візітацый перыяду XVII – першай паловы XIX ст. Сёння ад тых могілак ніякіх слядоў не захавалася, на іх месцы знаходзіцца гарадскі рынак.

Як асобнае месца пахавання вылучым і сам былы касцёл, яго крыпту. Касцёл у Ляхавічах з'яўляўся мемарыялам нацыянальнага героя Тадэвуша Рэйтана – знакамітага пасла на Варшаўскі сойм і нясхільнага праціўніка падзелу Рэчы Паспалітай. У касцёле быў алтар у гонар Св. Тадэвуша, фундаваны Дамінікам Рэйтанам [10]. Пасля смерці Тадэвуша Рэйтана 8 жніўня 1780 г. ён быў пахаваны пры алтары свайго патрона ў скляпеннях ляхавіцкага касцёла [11]. У касцёле знаходзілася і адпаведная мемарыяльная табліца ў гонар патрыёта [12].

«Новыя» каталіцкія могілкі ў Ляхавічах з'явіліся ў пачатку XX ст. недалёка ад новаўзведзенага ў той час касцёла Святога Язэпа. Пахаванні на могілках размяшчаюцца храналагічна па сектарах. На іх старой частцы (да 1945 г.) прадстаўлены надмагільныя пліты і крыжы. На новых каталіцкіх могілках заслугоўвае ўвагі элемент ушанавання тых магіл, якія зніклі натуральным чынам: на вялікім крыжы, да якога дапасаваныя элементы страчаных магіл, усталяваная шыльда з тэкстам «Памяць безыменным магілам». Старая частка могілак дагледжана, пахаванні ў годным стане.

**Яўрэі**. Паводле планаў 1930-х гг. у Ляхавічах вядома лакацыя двух яўрэйскіх некропаляў. Ні адзін з іх да нашага часу не захаваўся, пахаванні былі знішчаны ў перыяд 1950-х–1960-х гг., надмагіллі цалкам страчаны. На месцы аднаго некропаля, больш старога, змяшчаецца га-

радская сярэдняя школа. На месцы другога – аўтадром. Выгляд могілак і шэрагу помнікаў вядомыя па старых фотаздымках. Таксама да яўрэйскіх пахаванняў аднясём пахаванне ахвяр халакосту. На месцы расстрэлу ахвяр ляхавіцкага гета ўсталяваны адмысловы помнік.




**Мал. Некропалі ў гарадской прасторы Ляхавічаў**

**Мусульмане**. Татарскія могілкі з помнікамі, якія датуюцца канцом XVIII ст. знаходзяцца за межамі гораду. Пахаванні на іх ажыццяўляліся па спрадвечнай мусульманскай традыцыі. Некропаль не перарываў свайго існавання, пахаванні на ім ажыццяўляюцца і сёння татарскай супольнасцю Ляхавічаў. На старажытных помніках і на сучасных можна сустрэць надпісы арабскай вяззю.

Таксама акрэслім, што ў горадзе прадстаўлены асобныя мемарыяльныя пахаванні салдат Першай і Другой Сусветнай вайны.

Такім чынам, разгледзеўшы некропалі гарадской прасторы Ляхавічаў, можна адзначыць наступнае:

1) з гістарычных месцаў пахавання найбольш трывалым з'яўляецца татарскі некропаль, які не мяняў сваёй лакацыі. На надмагільных плітах захоўваецца каштоўная інфармацыя аб татарскай генеалогіі і гісторыі гэтай этнічнай супольнасці горада;

2) праваслаўныя і каталіцкія могілкі змянялі свае лакацыі, адпаведна, губляліся помнікі і інфармацыя, перарывалася культура памяць (самыя старыя пахаванні ў горадзе датуюцца сярэдзінай XIX ст.);

3) ляхавіцкія яўрэйскія могілкі зніклі цалкам, памяць аб яўрэйскай грамадзе ўвасобілася ў помніку ахвярам халакосту.

Абагульненая лакалізацыя некропалей горада Ляхавічы прадстаўлена на малюнку 1.


1. Булаты, П. Ю. Знешні выгляд і лакалізацыя старажытнай царквы ў Ляхавічах (XVI–XVIII ст.) / П. Ю. Булаты // Православие и цивилизационный выбор Беларуси. мат. XVIII сем., 13–14 декабря 2019 г.: Минская духовная семинария. – Жировичи, 2020. – С. 89–95.
2. Булаты, П. Ю. Ляхавіцкае графства ў сістэме магнацкіх уладанняў (XVI–XVIII ст.). / П. Ю. Булаты. – Мінск : БДУФК, 2020. – 217 с.
3. Візіты уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг.: зб. дак. / склад. Дз. В. Лісейчыкаў. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2009. – 270 с.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41248.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф.1781. Воп. 27. Спр. 223.
6. Описание церквей и приходов Минской епархии 1878/79 гг. – Минск : Типолитография Б. И. Соломонова, 1879.
7. Российская государственная библиотека. – Ф. 304.I. – Л. 73–73 об.
8. Свяжынскі, У. М. «Гістарычныя запіскі» Фёдара Еўлашоўскага / У. М. Свяжынскі – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 121 с.
9. Стороженко, А. Освящение римско-католического костёла в с. Ляховичи в православную церковь / А. Стороженко – Вильна, 1867. – 13 с.
10. Lietuvos mokslų akademijos biblioteka. – F. 273. Nr. 3587.
11. Niemcewicz, J. Żywot Tadeusza Rejtana / J. Niemcewicz // Potrety wsławionych Polaków. – Warszawa, 1820. – S. 3–7.
12. Stołyhwo, K. W sprawie szczątków i typu antropologicznego Tadeusza Reytena posła Nowogródzkiego / K. Stołyhwo // Sprawozdania z Posiedzeń Towarzystwa Naukowego Warszawskiego. – 1931. – Wydział II. Z. 1–6. – S. 1–13.
13. Vilniaus universiteto biblioteka. – F. 57. V. Б54. Nr. 51.


**Бухал Е. Н.**

## МУЗЕЕФИКАЦИЯ «НЕУДОБНОГО НАСЛЕДИЯ»

***Ключевые слова***: историко-культурное наследие, публичная история, места памяти, «неудобное наследие», репрезентация прошлого.

В процессе музеефикации и популяризации особое место занимают объекты «неудобного» наследия. Здесь рассмотрим теоретические обоснования обозначение наследия как «сложного», «оспариваемого», «темного» и синонимичных определений, исследовательские проблемы и стратегии, которые рассматривают в связи с таким наследием, а